# Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Кабінетам Міністраў Украіны аб зацвярджэнні Палажэння аб дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай*

*Уступіла ў сілу 25 лістапада 2014 года*

* Зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 24 лістапада 2014 г. № 1097 «Аб зацвярджэнні Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Кабінетам Міністраў Украіны аб зацвярджэнні Палажэння аб дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай» (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 26.11.2014, 5/39737).

Урад Рэспублікі Беларусь і Кабінет Міністраў Украіны (далей – Бакі),

кіруючыся артыкулам 3 Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай аб дзяржаўнай граніцы ад 12 мая 1997 года,

жадаючы вызначыць парадак дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай,

дамовіліся аб ніжэйпададзеным:

**Артыкул 1**

Зацвердзіць Палажэнне аб дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай (дадаецца).

**Артыкул 2**

Па ўзаемнай згодзе Бакоў у дадзенае Пагадненне могуць уносіцца змяненні і дапаўненні, якія афармляюцца асобнымі пратаколамі. Такія пратаколы будуць неад’емнай часткай дадзенага Пагаднення і будуць уступаць у сілу ў парадку, прадугледжаным для дадзенага Пагаднення.

Дадзенае Пагадненне ўступае ў сілу з даты атрымання апошняга пісьмовага паведамлення аб завяршэнні ўнутрыдзяржаўных працэдур, неабходных для ўступлення яго ў сілу, і дзейнічае да ўступлення ў сілу дэмаркацыйных дакументаў.

Здзейснена ў г. Чарнігаве 30 ліпеня 2014 года ў двух экзэмплярах, кожны на беларускай і ўкраінскай мовах, пры гэтым абодва тэксты з’яўляюцца аўтэнтычнымі.

| | |
|---|---|
| **За Урад Рэспублікі Беларусь** | **За Кабінет Міністраў Украіны** |
| **Подпіс** | **Подпіс** |

Дадатак
да Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Кабінетам Міністраў Украіны аб зацвярджэнні Палажэння аб дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай

## ПАЛАЖЭННЕ
## аб дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай

### ГЛАВА 1
### АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Палажэнне аб дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай (далей – Палажэнне) вызначае парадак дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы паміж

Рэспублікай Беларусь і Украінай і з'яўляецца прававой асновай дзейнасці Сумеснай беларуска-ўкраінскай дэмаркацыйнай камісіі (далей – Сумесная камісія).

2. У дадзеным Палажэнні выкарыстоўваюцца наступныя паняцці і іх азначэнні:

дзяржаўная граніца паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай (далей – дзяржаўная граніца) – лінія і вертыкальная паверхня, якая праходзіць па гэтай лініі, што падзяляе тэрыторыі (сушу, воды, нетры і паветраную прастору) Рэспублікі Беларусь і Украіны, вызначаная Дагаворам паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай аб дзяржаўнай граніцы ад 12 мая 1997 года (далей – Дагавор);

дэмаркацыя дзяржаўнай граніцы – абазначэнне на мясцовасці праходжання дзяржаўнай граніцы пагранічнымі знакамі з састаўленнем дэмаркацыйных дакументаў;

пагранічны знак – збудаванне, прызначанае для абазначэння дзяржаўнай граніцы на мясцовасці;

паласа мацавання дзяржаўнай граніцы – участак мясцовасці шырынёй дзесяць метраў, па пяць метраў у абодва бакі ад дзяржаўнай граніцы, прызначаны для абазначэння дзяржаўнай граніцы пагранічнымі знакамі і забеспячэння належнага ўтрымання дзяржаўнай граніцы.

## ГЛАВА 2
## ДЗЕЙНАСЦЬ СУМЕСНАЙ КАМІСІІ

3. Сумесная камісія ўтвараецца ў адпаведнасці з Дагаворам з мэтай дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы.

У сваёй дзейнасці Сумесная камісія кіруецца Дагаворам, нацыянальнымі заканадаўствамі і дадзеным Палажэннем.

4. Сумесная камісія складаецца з дэлегацый Рэспублікі Беларусь і Украіны (далей – дэлегацыі). Кожную з дэлегацый узначальвае кіраўнік (глава) дэлегацыі.

5. Персанальны склад Сумеснай камісіі вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствамі Рэспублікі Беларусь і Украіны. Захаванне парытэту ў колькасным складзе дэлегацый не абавязкова.

Інфармаванне аб персанальным складзе дэлегацый ажыццяўляецца па дыпламатычных каналах.

Па меры неабходнасці дэлегацыі могуць прыцягваць для працы экспертаў і тэхнічны персанал.

6. Асноўныя задачы Сумеснай камісіі:

падрыхтоўка дакументаў, неабходных для правядзення дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы;

арганізацыя работ па дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы;

састаўленне дэмаркацыйных дакументаў.

7. Функцыі Сумеснай камісіі:

вызначэнне тыпаў і канструкцый пагранічных знакаў, а таксама месцаў іх устаноўкі на дзяржаўнай граніцы;

вызначэнне парадку і тэрмінаў выканання дэмаркацыйных работ, а таксама кантроль іх якасці;

фарміраванне сумесных рабочых груп па выкананні дэмаркацыйных работ;

разгляд і зацвярджэнне дакументаў, падрыхтаваных рабочымі групамі;

распрацоўка пры неабходнасці прапаноў па ўдакладненні праходжання дзяржаўнай граніцы на мясцовасці;

арганізацыя прыёмкі дэмаркацыйных работ;

састаўленне і выданне дэмаркацыйных дакументаў;

вырашэнне іншых задач, звязаных з дэмаркацыяй дзяржаўнай граніцы.

8. У мэтах ажыццяўлення дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы Сумесная камісія распрацоўвае і зацвярджае наступныя дакументы:

інструкцыю аб парадку абазначэння дзяржаўнай граніцы;

праект расстаноўкі пагранічных знакаў на дзяржаўнай граніцы;

інструкцыі для рабочых груп па дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы;

інструкцыю аб парадку вынясення на мясцовасць дзяржаўнай граніцы;

інструкцыю па правядзенні гідраграфічных работ;

інструкцыю па стварэнні дэмаркацыйных дакументаў.

Назвы пералічаных дакументаў могуць удакладняцца ў ходзе іх састаўлення.

Пры неабходнасці Сумесная камісія ў межах сваёй кампетэнцыі распрацоўвае і зацвярджае іншыя дакументы.

9. Сумесная камісія ажыццяўляе сваю дзейнасць у форме пасяджэнняў, якія праводзяцца па чарзе на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і Украіны.

На пасяджэнні старшынствуе кіраўнік (глава) той дэлегацыі, на тэрыторыі дзяржавы якой праводзіцца пасяджэнне.

Месца і тэрміны правядзення чарговага пасяджэння вызначаюцца на папярэднім пасяджэнні і пацвярджаюцца пісьмова не пазней чым за 15 дзён да яго пачатку. Пры неабходнасці паміж пасяджэннямі могуць праводзіцца сустрэчы кіраўніка і главы дэлегацый.

Па выніках пасяджэння складаецца пратакол у двух экзэмплярах, кожны на рускай і ўкраінскай мовах. Пратакол пасяджэння падпісваецца кіраўніком і главой дэлегацый.

Дэлегацыі ўзгадняюць парадак асвятлення ў сродках масавай інфармацыі вынікаў дзейнасці Сумеснай камісіі.

10. Пры неабходнасці Сумесная камісія можа арганізоўваць сустрэчы рабочых груп па асобных пытаннях.

11. Пытанні, не вырашаныя Сумеснай камісіяй, вырашаюцца шляхам кансультацый і перагавораў паміж Бакамі.

12. Афіцыйнымі мовамі Сумеснай камісіі з’яўляюцца беларуская (руская) і ўкраінская мовы.

Усе дакументы, акрамя дэмаркацыйных дакументаў, распрацоўваюцца на беларускай (рускай) і ўкраінскай мовах.

Рабочай мовай Сумеснай камісіі з’яўляецца руская мова.

13. Кожная дэлегацыя забяспечвае на тэрыторыі сваёй дзяржавы правядзенне пасяджэнняў Сумеснай камісіі і сустрэч яе рабочых груп. Выдаткі, звязаныя з пражываннем, кожная дэлегацыя пакрывае за свой кошт.

## ГЛАВА 3
## ДЭМАРКАЦЫЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ ГРАНІЦЫ

14. Пры вызначэнні праходжання і абазначэнні дзяржаўнай граніцы на мясцовасці Сумесная камісія кіруецца Дагаворам і прыкладзенымі да яго Пратаколам-апісаннем праходжання лініі дзяржаўнай граніцы і Альбомам тапаграфічных карт з графічна нанесенай на іх лініяй дзяржаўнай граніцы.

У якасці дапаможных матэрыялаў могуць выкарыстоўвацца дакументы земле- і лесаўпарадкавання.

15. Дзяржаўная граніца на мясцовасці абазначаецца наступнымі тыпамі пагранічных знакаў:

асноўны пагранічны знак (дадатак 1);

рачны пагранічны знак (дадатак 2);

пераходны пагранічны знак (дадатак 3);

азёрны пагранічны знак (дадатак 4);

прамежны пагранічны знак (дадатак 5).

Дзяржаўная граніца можа таксама абазначацца спецыяльнымі пагранічнымі знакамі, якія ўстанаўліваюцца ў месцах, дзе з-за асаблівасцяў мясцовасці абазначэнне яе праходжання іншымі тыпамі пагранічных знакаў немэтазгодна, або для захавання існуючых на дзяржаўнай граніцы збудаванняў. Канструкцыі спецыяльнага пагранічнага знака вызначаюцца Сумеснай камісіяй.

У выпадку змены размалёўкі пагранічных слупоў, формы відарысу на іх дзяржаўнай сімволікі і нумара пагранічнага знака Бакі інфармуюць адзін аднаго па дыпламатычных каналах.

Пагранічным знакам прысвойваюцца парадкавыя нумары.

Стыкі дзяржаўных граніц Рэспублікі Беларусь, Украіны і Расійскай Федэрацыі; Рэспублікі Беларусь, Украіны і Рэспублікі Польшча абазначаюцца спецыяльнымі пагранічнымі знакамі ў адпаведнасці з трохбаковымі міжнароднымі дагаворамі.

16. Паласа мацавання дзяржаўнай граніцы чысціцца ад дрэў, кустоў і іншых прадметаў, якія ствараюць перашкоды прамой бачнасці паміж суседнімі пагранічнымі знакамі.

На рачных участках чысціцца паласа мясцовасці па пяць метраў у кожны бок ад пагранічнага слупа і паміж пагранічнымі слупамі, якія ўваходзяць у склад аднаго пагранічнага знака.

17. Дэмаркацыйныя работы кожная дэлегацыя на тэрыторыі сваёй дзяржавы ажыццяўляе самастойна.

18. Дэлегацыі ў адпаведнасці з заканадаўствамі Рэспублікі Беларусь і Украіны могуць абменьвацца аэрафотаздымачнымі, геадэзічнымі, картаграфічнымі і іншымі матэрыяламі і данымі, што выкарыстоўваюцца для ажыццяўлення дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы.

19. Па выніках дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы Сумесная камісія састаўляе наступныя дэмаркацыйныя дакументы:

апісанне праходжання дзяржаўнай граніцы;

дэмаркацыйную карту;

пратаколы пагранічных знакаў;

каталог каардынатаў пагранічных знакаў;

табліцу прыналежнасці астравоў;

заключны пратакол дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы.

Назвы і пералік дэмаркацыйных дакументаў могуць удакладняцца ў ходзе іх састаўлення.

Дэмаркацыйныя дакументы састаўляюцца без абмежавальных грыфаў і выдаюцца ў двух экзэмплярах, кожны на беларускай і ўкраінскай мовах.

Дэмаркацыйныя дакументы падпісваюцца кіраўніком і главой дэлегацый і ўступаюць у сілу з даты атрымання апошняга пісьмовага паведамлення аб выкананні ўнутрыдзяржаўных працэдур, неабходных для ўступлення іх у сілу.

Дадатак 1
да Палажэння аб дэмаркацыі
дзяржаўнай граніцы паміж
Рэспублікай Беларусь і Украінай

## АСНОЎНЫ ПАГРАНІЧНЫ ЗНАК
## (з трох элементаў)

**Рэспубліка Беларусь** **Украіна**




## ПАГРАНІЧНЫ СЛУП РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



**ПАГРАНІЧНЫ СЛУП УКРАІНЫ**




**ЦЭНТРАВЫ СЛУПОК**



Від зверху




**АСНОЎНЫ ПАГРАНІЧНЫ ЗНАК**
**(з аднаго элемента)**



Дадатак 2
да Палажэння аб дэмаркацыі
дзяржаўнай граніцы паміж
Рэспублікай Беларусь і Украінай

**РАЧНЫ ПАГРАНІЧНЫ ЗНАК**




Від зверху



Дадатак 3
да Палажэння аб дэмаркацыі
дзяржаўнай граніцы паміж
Рэспублікай Беларусь і Украінай

**ПЕРАХОДНЫ ПАГРАНІЧНЫ ЗНАК**




Від зверху



Дадатак 4
да Палажэння аб дэмаркацыі
дзяржаўнай граніцы паміж
Рэспублікай Беларусь і Украінай

**АЗЁРНЫ ПАГРАНІЧНЫ ЗНАК**




Від зверху



Дадатак 5
да Палажэння аб дэмаркацыі
дзяржаўнай граніцы паміж
Рэспублікай Беларусь і Украінай

**ПРАМЕЖНЫ ПАГРАНІЧНЫ ЗНАК**




